**Бяззлучнікавыя складаныя сказы**

**Варыянт 1**

**1. Выпішы бяззлучнікавыя складаныя сказы, расстаў знакі прыпынку, складзі схемы бяззлучнікавых складаных сказаў.**

Са старажытнасці людзі імкнуліся жыць бліжэй да вады. Ва ўсе часы яна шмат значыла для чалавека ратавала ад засухі голаду. На рэках будаваліся млыны узводзіліся плаціны для арашэння зямлі перавозіліся самыя разнастайныя грузы. Вада наш пастаянны і надзейны духоўны лекар яна дае сілы бадзёрасць здароўе. Бясспрэчна, што плаванне загартоўвае і ўмацоўвае чалавека, як ніякі іншы від спорту. А якое задавальненне атрымліваеш, седзячы за вёсламі на лодцы. Вось дзе і экзотыка, і адпачынак, і спорт усё разам.

**2. Запішы тэкст, расставіўшы знакі прыпынку, уставіўшы патрэбныя літары.**

На(т,д) абрывістым берагам Нёмана стая(л,ў) стары прысад…істы тоўсты дуб. Доўгі час бераг знаходз…ўся пад вадою (па)волі асоўваўся і агаляў тоўстыя карані старога дуба. Сам гэты дуб крыху пах…ліўся (на)бок працягнуты пад вадою яго корань здаваўся нагою. Выходзіла так дуб збіраўся перабрыс…ці Нёман. Сеўшы на гэтым карані Базыль бачыў бегалі дробныя хвалі зв…валася ў вадзе доўгая раска. Вада то ўздымала яе то апускала то ра…кідала ва ўсе бакі і гуляла ёю як ве(т,ц)ер дымам.

**3. Дапішы сказы па пачатку.**

На зямным шары больш за тры тысячы моў; наша родная мова, якую беларускі народ пранёс праз стагоддзі, з’яўляецца ... .

І гэты скарб ніхто і ніколі адабраць у нас не здолее, бо… .

Лёс роднай мовы залежыць ад нас… .

Але, каб добра ёю валодаць, спачатку трэба … .

**4. Складзі сказы па схемах.**

[…], […].

[…] – […].

[…]: […].